Хоцімская раённая бібліятэчная сетка
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі



# Чытаем па-беларуску: паэзія XX - XXI стагоддзяў

Віртуальная выстава

# XX стагоддзе

**Броўка, П. Крыніца з-пад Вушачы** : вершы і паэмы / Пятрусь Броўка ; укладальнік Р. І. Барадуліна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 366 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0600-4.
ББК 84(4Беи)-5
Б 88

Кнігу выбранай лірыкі народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі склалі вершы і паэмы са зборнікаў “Між чырвоных рабін”, “Калі ласка”, “Ты — мая пчолка” і інш.



**Караткевіч, У. С. На Беларусі Бог жыве…** : вершы, паэмы / Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч ; укладальнік В. Шніпа. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 254 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0985-6.
ББК 84(4Беи)-5
К 21




У кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа Уладзіміра Караткевіча (1930–1984) увайшлі паэтычныя творы, якія даўно сталі класікай беларускай літаратуры. Яны вызначаюцца рамантычнай узнёсласцю і грамадзянскай страснасцю, нечаканай вобразнасцю і глыбінёй зместу.

**Геніюш, Л. А. Гасціна** : выбранае / Ларыса Антонаўна Геніюш ; укладальнік З. Пазняк. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. — 382 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0278-5.
ББК 84(4Беи)6
Г 34




Кнігу слыннай беларускай паэтэсы Ларысы Геніюш (1910–1983) склалі вершы, напоўненыя сонечнай празрыстасцю, жыватворнымі, гаючымі сокамі роднай зямлі. У вершах яна заклікае любіць Бацькаўшчыну, свій народ, дадзеную продкамі пывучую беларускую мову.

**Дубоўка, У. М. О Беларусь, мая шыпшына…** : выбранае / Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка ; укладальнік Дз. М. Давідоўскага, З. К. Пазняк (У. Шэкспір. Санеты). — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 318 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0531-8.
ББК 84(4Беи)6-5
Д 79




У кнігу майстра самабытнага паэтычнага беларускага слова Уладзіміра Дубоўкі (1900–1976) увайшлі творы, якія друкаваліся ў зборніках “Строма” (1923), “Трысцё” (1925), “Credo” (1926), “Наля” (1927) і інш. У выдатным перакладзе паэта з непаўторнай прыгажосцю гучаць санеты Шэкспіра.

Паэзія У. Дубоўкі поўніцца гукамі і водарам роднай зямлі.

Чытаем па-беларуску!
паэзія
XX - XXI
стагоддзяў

**Лукша, В. А. І родны дом, і цэлы свет** : паэзія / Валянцін Антонавіч Лукша. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 254 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0831-7.
ББК 84(4Беи)-5
Л 84




У кнігу лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Валянціна Лукшы ўвайшлі лепшыя творы, напісаныя амаль за 50 гадоў творчай дзейнасці паэта.

**Мацяш, Н. І. Душою з небам гаварыць…** : выбраная лірыка / Ніна Іосіфаўна Мацяш. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. — 462 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0438-9.
ББК 84(4Беи)6
М 36

Галоўным матывам творчасці лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова Н. Мацяш застаецца роздум над гістарычным лёсам і непарыўна звязаным з ім сённяшнім днём Беларусі. Лірычная споведзь паэтэсы спалучае філасофскую развbooж лівасць і рамантычнае светаўспрыманне, глыбокае веданне сусветнай культуры і нязменную блізкасць да нацыянальнага быцця.



**Панчанка, П. Е. Жытнёвы звон** : выбранае / Пімен Емяльянавіч Панчанка ; укладальнік З. К. Панчанкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. — 335 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0545-9.
ББК 84(4Беи)6-5
П 16




У кнігу народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі (1917–1995) увайшлі выбраныя вершы з кніг “Пры святле маланак”, “Дзе начуе жаўранка”, “Маўклівая малітва”, “Крык сойкі”, “Вячэрні цягнік” і вершы з франтавых дарог.

**Разанаў, А. С. Танец з вужакамі** : выбранае / Аляксандр Сцяпанавіч Разанаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. — 462 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0468-0.
ББК 84(4Беи)6
Р 17

Публікацыя ў 1966 годзе вершаў адзінаццацікласніка Алеся Разанава стала падзеяй у беларускай паэзіі. Але падзеяй у беларускай паэзіі стала наогул уся творчасць паэта, з чыім імем звязаны яе найбольш прынцыповыя дасягненні апошніх дзесяцігоддзяў. Класічны традыцыяналіст і разам з тым яркі наватар, А. Разанаў увёў у паэзію свае новыя жанры, здзейсніўся, па словам крытыкі, як школа і як накірунак і, нягледзячы на шчыльныя ідэалагічныя забароны, сказаў непаўторнае слова пры час і пра сябе.

Падводзячы рысу пад здзейсненым, кніга выбраных твораў тоіць у сабе магчымасці ўсё новага прачытання і скіравана ў наступнасць "якая заўсёды тут".



**Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва…** : выбраная лірыка / Максім Танк ; укладальнік В. Рагойшы. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 479 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0613-6.
ББК 84(4Беи)-5
Т 18




У кнігу народнага паэта Беларусі Максіма Танка ўвайшлі ўзоры яго інтымнай, грамадзянскай, пейзажнай і філасофскай лірыкі, а таксама асобныя сатырычныя вершы. Творы згрупаваны ў асобныя раздзелы паводле іх жанравай прыналежнасць, што, апрача ўсяго, дазваляе не толькі лепш задаволіць разнастайны густ шырокага чытача, але і зручней карыстацца кнігай пры вывучэнні “праграмных” твораў паэта ў сярэніх і вышэйшых навучальных установах нашай краіны.

**Федзюковіч, М. Красадзён** : вершы, пераклады / Мікола Федзюковіч ; укладальнік В. Гардзей. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. — 319 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1060-9.
ББК 84(4Беи)-5
Ф 32

Красадзён — шматгадовая травяністая расліна сямейства лілейных, якая на пачатку лета цвіце прыгожымі цёмна-аранжавымі кветкамі. Так хацеў назваць свій чарговы паэтычны зборнік Мікола Федзюковіч, але, на жаль, здаць рукапіс у выдавецтва не паспеў. Цяпер пад той жа назвай выйшла кніга выбраных вершаў паэта з яго не дужа і вялікай па аб’ёму спадчыны.

Паэзію Міколы Федзюковіча высока цанілі класікі беларускай літаратуры Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Міхась стральцоў. У кнігу “Красадзён” увайшлі лепшыя творы з прыжыццёвых зборнікаў паэта “Зямля — магніт”, “Мілавіца”, “Птушыны гай”, “Макаў цвет”, а таксама яго пераклады з еўрапейскіх моў.



Чытаем па-беларуску: паэзія XX - XXI стагоддзяў

**Янішчыц, Я. І. Пачынаецца ўсё з любві** : вершы, паэмы / Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 339 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0986-3.
ББК 84(4Беи)-5
Я 62




Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы і прэміі Ленінскага камасамола Беларусі, Яўгенія Янішчыц сваімі арыгінальнымі, рамантычна-ўзвышанымі і ў той жа час задушэўна-інтымнымі вершамі даўно вядома шырокаму колу чытачоў. Тонка адчуваючы сваю кроўную сувязь з роднай зямлёй, паэтэса ўражвае глыбінёй асэнсавання складаных праблем сучаснасці, прагай сцвярджэння высакародных адносінаў паміж людзьмі.

У кнігу ўвайшло лепшае з напісанага паэтэсай.

**Я хацеў вам сказаць…** : вершы, паэмы / укладальнік В. Шніпа. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 302 с. — (Беларуская паэзія ХХ стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0997-9.
ББК 84(4Беи)-5
Я 90




“Я хацеў вам сказаць…” — кніга выбраных твораў пяці паэтаў. Лёсы іх шмат у чым падобныя сваёй трагічнасцю, але іхнія паэтычныя галасы вельмі розныя. Вершы А. Сыса, В. Стрыжака, І. Рубіна, В. Гадулькі і М. Купрэева сёння праходзяць выпрабаванне часам, але, думаецца, многія творы гэтай кнігі назаўсёды застануцца ў залатым фондзе паэзіі ХХ стагоддзя.

**Куляшоў, А. А. Дарогі** : вершы, паэмы / Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 318 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0579-2.
ББК 84(4Беи)-5
К 90




Паэзія Аркадзя Куляшова (1914–1978) — гэта вечная захопленасць жыццём і творчае гарэнне, яркасць пачуццяў, нястомнае напружанне душы і думкі, пазнанне сябе і людзей.

У кнігу ўвайшлі лепшыя вершы з творчай спадчыны паэта, паэмы “Цунамі”, “Хамуціус”, “Варшаўскі шлях”.

**Пісьмянкоў, А. У. Я не памру, пакуль люблю** : выбранае / Алесь Уладзіміравіч Пісьмянкоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. — 319 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0072-3.
ББК 84(4Беи)6
П 35




У лірыцы лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова Алеся Пісьмянкова рэаліі сённяшняга жыцця цесна пераплецены з рэаліямі мінулага. Яго лірычны герой часта звяртаецца да духоўнага вопыту продкаў. Разам з імі шукае адказы на адвечныя пытанні. Вершым паэта характэрны прачулы лірызм і шчырасць інтанацыі.

Гэтую кнігу склалі лепшыя вершы са зборнікаў “Белы Камень”, “Чытаю зоры”, “Планіда” і інш.

**Душа мая тужлівая…** : вершы, паэмы / укладальнік В. Шніпа. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. — 303 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 985-02-0753-1.
ББК 84(4Беи)-5
Д 86




“Душа мая тужлівая…” — своеасаблівая анталогія паэзіі 20–30-х гадоў мінулага стагоддзя. Лёс пятнаццаці паэтаў, творы якіх увайшлі ў гэтую кнігу, амаль адноклькавы — яркі, адметны прыход у літаратуру, жаданне мастацкім словам данесці свае думкі, перажыванні… Выхад у свет паэтычных кніг… І амаль аднолькавы трагічны лёс чакаў іх наперадзе… Паэзія А. Дудара, У. Жылкі, Ю. Лявоннага, Ю. Таўбіна і іншых, вытрымаўшы выпрабаванне часам, будзе цікавая і сённяшняму чытачу.

**Карызна, У. І. Доля Русь наша Белая** : вершы, паэмы, песні / Уладзімір Іванавіч Карызна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 334 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0924-5.
ББК 84(4Беи)-5
К 27




У кнігу выбранай лірыкі вядомага паэта, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі і прэміі прафсаюўзаў Беларусі Уладзіміра Карызны ўвайшлі вершы і паэмы са зборнікаў “Жураўліны досвітак”, “Святло ліўня”, “Цеплыня”, “Цішыня баразны”, “Музыка ў свеце” і іншыя, а таксама многія папулярныя песні на словы паэта з нотамі.


XXI
стагоддзе

**Рублеўская, Л. І. Шыпшына для Пані** : вершы і эсэ / Людміла Іванаўна Рублеўская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 254 с. — (Беларуская паэзія XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-0893-4.
ББК 84(4Беи)
Р 82




Вобраз Пані — улюбёны вобраз поэзіі Людмілы Рублеўскай, яе альтэр эга, рамантычная творчая жанчына, датклівая і чуллівая, здольная на самаахвяраванне ў імя кахання, яна адчувае сябе чужой у сваім часе і пакутліва шукае ўзаемаразумення. Але адначасова — дастаткова моцная каб прыняць на сябе адказнасць за лёс Радзімы, абараніць свій талент і сваё каханне.

Любоў да Беларусі, да яе гісторыі, павага да тых, хто працаваў на захаванне культурнай спадчыны народа, праблема захавання гістарычнай памяці — асноўны лейтматыў многіх твораў Людмілы Рублеўскай.

Чытаем па-беларуску:
паэзія
XX - XXI
стагоддзяў

**Шніп, В. А.** **Проза і паэзія агню** : вершы, аповесць, эсэ / Віктар Анатольевіч Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010. — 318 с. — (Беларуская паэзія XXI стагоддзя).

ISBN 978-985-02-1181-1.
ББК 84(4Беи)
Ш 77

Новая кніга Віктара Шніпа адкрываецца раздзелам “Балады крыві і любові”, у якім змешчана каля 170 балад, прысвечаных гістарычным асобам нашай краіны, сярод якіх Еўфрасіння Полацкая, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Мікалай Радзівіл, Станіслаў Манюшка, Напалеон Орда, Янка Купала, Максім Багдановіч… У раздзеле “Роднае і вечнае” змешчаны празаічныя мініяцюры філасофскага характару. Для тых, хто любіць прозу пра каханне, - аповесць “Паэт, у якога ўсе дома”.

